## § 71. Пытальныя і адносныя займеннікі

**457.** Прачытайце тэкст. Сказы якіх тыпаў ужываюцца ў тэксце? Якія словы дапамаглі аўтару задаць пытанні?

— Што ты робіш, Вова?
— Пішу пісьмо.
— Каму?
— Сабе.
— Пра што ты пішаш?
— Як атрымаю, тады скажу.

*І. Курбека.*

Вызначце, у якой форме ўжыты займеннік *сабе*.

! Займеннікі ***хто? што? які? чый? каторы? колькі?*** называюцца **пытальнымі.** Займеннікі ***хто, што, які, чый, каторы, колькі*** называюцца **адноснымі.** Пытальныя і адносныя займеннікі з'яўляюцца амонімамі.

Пытальныя займеннікі выкарыстоўваюцца ў пытальных сказах: *І **што** ёсць на свеце мілейшае за цябе, пара́ маладога жыцця*? (Я. Колас).

Адносныя займеннікі ў асноўным служаць для сувязі частак у складаным сказе: *Ты сцягу, **што** над галавою, будзь верны!* (П. Броўка).

**458.** Прачытайце табліцу. Дапоўніце яе формамі займеннікаў. Параўнайце канчаткі займеннікаў *хто* і *што.*

| Склон | Скланенне займеннікаў *хто, што* | |
|---|---|---|
| Н. | *хт**о*** | *шт**о*** |
| Р. | *к**аго*** | *ч**аго*** |
| Д. | ... | *ч**аму*** |
| В. | *к**аго*** | *шт**о*** |
| Т. | ... | *ч**ым*** |
| М. | *(пры) к**ім*** | ... |

З займеннікамі *хто* і *што* ў давальным склоне складзіце сказы.

Пытальныя і адносныя займеннікі ***хто? хто; што? што; колькі? колькі*** змяняюцца па склонах, а займеннікі ***які? які; чый? чый; каторы? каторы*** — па склонах, ліках і родах (у адзіночным ліку).



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**459.** Прачытайце пары сказаў. Вызначце, да якіх разрадаў адносяцца выдзеленыя займеннікі. З якой мэтай яны ўжываюцца ў сказах?

1. **Хто** сёння дзяжурны? Сяргей, скажы, **хто** сёння дзяжурны. 2. **Якія** ў цябе планы на выхадны дзень? Я помню, **якія** ў цябе планы на выхадны дзень. 3. **Чыя** гэта песня гучыць па радыё? Марыля здагадалася, **чыя** песня гучыць па радыё[ф]. 4. **Колькі** вучняў наведвае факультатыўныя заняткі? Дырэктар спытаў, **колькі** вучняў наведвае факультатыўныя заняткі.

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаных сказах. Складзіце іх схемы.

Папрацуйце ў парах. Задайце адзін аднаму пытанні і адкажыце на іх.

!

Займеннікі ***які?*** і ***які*** ва ўскосных склонах маюць канчаткі, як у займенніка *сам*: *як*|***ога***|, *як*|***ому***|, *як*|***ім***| і г. д. Займеннікі ***чый?*** і ***чый*** ва ўсіх склонах змяняюцца, як займеннікі *мой, твой, свой*.

Займеннік ***колькі*** ва ўскосных склонах мае канчаткі, як прыметнік *сіні* ў множным ліку: Р. скл. *кольк*|***іх***|; Д. скл. *кольк*|***ім***|; В. скл., як Н. ці Р. скл.; Т. скл. *кольк*|***імі***|; М. скл. *(на) кольк*|***іх***|.

**460.** Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак.

Лыжная акр..батыка — гэта зімовы від спорт.. . **Яго** яшчэ называюць фр..стайлам. У час спаборніцтваў спартсмен.. неабходна выканаць на..звычай складаны акр..батычны скачок. **Ён** праводзіцца са спецы..льнага трамплін.. . Фр..стайл, як і бі..тлон, з'яўляецца самым пасп..ховым алімпійскім відам спорт.. у нашай краіне. Беларускія фр..стайлісты ўжо заваявалі 8 алімпійскіх медал.. . Алімпійскімі чэмпі..намі сталі Аляксей Грышын, Ала Цупер, Антон Кушнір і Ганна Гуськова.




Да спаборніцтваў б..ларускія спартсмены рыхтуюцца ў тр..ніровачным цэнтр.. «Фрыстайл». Гэта ўнікальны спартыўны аб'ект.

**Яму** няма больш аналагаў нідзе ў свеце. Цэнтр у Мінск.. стаў першым крытым комплексам для лыжных акр..батаў. У **ім** беларускія фр..стайлісты маюць ма..чымасць якасна трэніравацца ў любую пару года.

Мы ганарымся перамогамі нашых спартсменаў *(Паводле В. Ванінай)*.

Вусна перабудуйце простыя сказы ў складаныя, замяняючы выдзеленыя займеннікі адноснымі.

Запішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары.

Разгледзьце фотаздымак. Што на ім адлюстравана? Раскажыце пра перамогі нашых спартсменаў на спаборніцтвах розных узроўняў.

**461.** Адгадайце народныя загадкі-жарты. Запішыце сказы, раскрываючы дужкі.

1. *(Які)* два[м] займеннікі перашкаджаюць дарожнаму руху? 2. Без *(што)* чалавек не можа жыць? 3. *(Што)* заканчваецца дзень? 4. Без *(што)* хаты не пабудуеш[сл]? 5. На дне *(які)* ракі плавае лічба? 6. *(Які)* соль нельга распусціць у вадзе?

Для даведкі: *літарай* **ь**; *я і мы; ноту соль; без імені; без стуку; Прыпяць.*

Вызначце разрад займеннікаў па значэнні, склон, лік (калі ёсць), род (калі ёсць). Падкрэсліце займеннікі як члены сказа.

## § 72. Няпэўныя займеннікі

**462.** Ад займеннікаў утварыце аднакаранёвыя словы.

***не***
***абы***

→

хто? што?
які? чый?
каторы?
колькі?

←

***сьці***
***небудзь***

Вызначце, на што ўказваюць утвораныя словы (на прадмет, прымету, колькасць). Ці вядомы вам гэтыя прадметы, прыметы, колькасць?

Ад займеннікаў якога разраду ўтварыліся новыя словы? Чаму, на вашу думку, гэтыя займеннікі называюцца няпэўнымі?



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**Няпэўныя** займеннікі ўказваюць на няпэўныя, невядомыя прадмет, прымету, колькасць: ***Нехта*** *спяшаецца,* ***камусьці*** *не спіцца,* ***некага*** *гоніць радасць адкрыцця* (С. Грахоўскі).

Няпэўныя займеннікі ўтвараюцца ад пытальных пры дапамозе прыставак ***не-*** і ***абы-***: ***не́хта, не́шта, не́йкі, не́чы, некато́ры, не́калькі; абы-хто́, абы-што́, абы-які́, абы-чы́й.***

Няпэўныя займеннікі таксама ўтвараюцца пры дапамозе марфем ***-сьці*** і ***-небудзь***, якія называюцца **постфіксамі:** ***хтосьці, штосьці, чыйсьці; хто-небудзь, што-небудзь, чый-небудзь, каторы-небудзь, колькі-небудзь.***

**463.** Прачытайце табліцу. Зрабіце вывад пра асаблівасці змянення няпэўных займеннікаў.

| Склон | Скланенне няпэўных займеннікаў | | | |
|---|---|---|---|---|
| Н. | *не́хта* | *штосьці* | *абы-які́* | *чый-небудзь* |
| Р. | *не́кага* | *чагосьці* | *абы-яко́га* | *чыйго-небудзь* |
| Д. | *не́каму* | *чамусьці* | *абы-яко́му* | *чыйму-небудзь* |
| В. | *не́кага* | *штосьці* | як Н. ці Р. | |
| Т. | *не́кім* | *чымсьці* | *абы-які́м* | *чыім-небудзь* |
| М. | *(на) не́кім* | *(на) чымсьці* | *(на) абы-які́м* | *(на) чыім-небудзь* |

Праскланяйце займеннікі *абы-хто* і *абы-што*.

**464.** Прачытайце тэкст. Да якога тыпу маўлення ён адносіцца?

### Пчаляр

Пчаляр — чалавек, які разводзіць і даглядае пчол. Часам ён нават размаўляе з імі, нібы яны разумеюць штосьці. Нейкі час пчаляр рамантуе і чысціць вуллі, а затым вывозіць іх да якіх-небудзь шчодрых меданосаў[с].

Многім людзям і сёння хочацца ласавацца сваім мёдам. Праўда, пчолы вядуцца не ў абы-якога гаспадара. Добры пчаляр назапашвае не колькі-небудзь кілаграмаў мёду. Ён будзе рады некалькім сотням кілаграмаў[сн]. Хопіць і для сябе, і для гасцей, і на продаж яшчэ нешта застанецца *(Паводле М. Маляўкі)*.

Выпішыце з тэксту няпэўныя займеннікі. Вызначце, у якой форме яны ўжыты. Якую сінтаксічную ролю яны выконваюць?

Знайдзіце ў тэксце аднакаранёвыя словы. Пакажыце, як яны ўтварыліся.

Прыстаўка ***не-*** і постфікс ***-сьці*** з займеннікамі пішуцца разам: *нехта, нейкі, штосьці, чыйсьці*.

Прыстаўка ***абы-*** і постфікс ***-небудзь*** з займеннікамі пішуцца праз злучок: *што-небудзь, які-небудзь, чый-небудзь*. Калі прыстаўка ***абы-*** аддзяляецца прыназоўнікам, то тады яна пішацца асобна: *абы з кім, абы перад чым*.

**465.** Прачытайце словазлучэнні.

Чем-то увлекаться, кого-то искать, беседовать лишь бы с кем, кому-то сказать, подарить чьему-либо сыну, вспоминать о нескольких встречах, идти на какую-нибудь выставку.

Запішыце словазлучэнні па-беларуску. Растлумачце напісанне слоў.

***не́чы*** ***чый-не́будзь***

**466.** Прачытайце табліцу. Зрабіце вывад пра асаблівасці скланення няпэўных займеннікаў.

| Склон | Скланенне займеннікаў *нейкі, нечы, некаторы* | | |
|---|---|---|---|
| Н. | *нейк**і*** | *неч**ы*** | *некатор**ы*** |
| Р. | *нейк**ага*** | *неч**ага*** | *некатор**ага*** |
| Д. | *нейк**аму*** | *неч**аму*** | *некатор**аму*** |
| В. | як Н. ці Р. | як Н. ці Р. | як Н. ці Р. |
| Т. | *нейк**ім*** | *неч**ым*** | *некатор**ым*** |
| М. | *(у) нейк**ім*** | *(у) неч**ым*** | *(у) некатор**ым*** |

## *Гавары і пішы правільна*

Пры вымаўленні займенніка ***некаторы*** і яго форм націск па́дае на ***о***: *некато́ры, некато́рага, некато́раму, некато́рым, некато́рыя, некато́рых* і інш.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**467.** Прачытайце тэкст, устаўляючы словы для даведкі ў патрэбнай форме. Якіх парад трэба прытрымлівацца, перш чым набываць свойскую жывёлу?

**«Хачу ката або сабаку»**

Перш чым прасіць у бацькоў купіць ката або сабаку, трэба высветліць:

1. Ці няма … у сям'і, хто супраць новага ж..хара ў доме?
2. Ці няма ал..ргіі на поўсць у … з с..мейнікаў?
3. Ці знойдзецца ў вас … зручнае месца для г..даванца?
4. Ці не баі..ся ты … ця..касцей пры доглядзе новага ж..хара?
5. Ці гатовы ты, што гадаванец можа зрабіць … шкоду або сапсаваць … рэчы?
6. Ці можаш ты … даручыць свайго гадаванца, калі паедзеш у летні лагер ці ў падарожжа разам з бацькамі? *(Паводле часопіса «Вясёлка»)*.

Для даведкі: *нехта, некаторы, які-небудзь, хтосьці, нечы, хто-небудзь, нейкі.*

Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары і няпоўныя займеннікі. Вызначце іх граматычныя прыметы. Растлумачце правапіс.

Раскажыце, як валанцёры дапамагаюць бяздомным жывёлам.

Уявіце, што вы ўдзельнічаеце ў дабрачыннай акцыі «Эстафета дабрыні». Якія мерапрыемствы вы прапануеце правесці, каб дапамагчы бяздомным жывёлам?

**468.** Спішыце сказы, раскрываючы дужкі і ўжываючы займеннікі ў патрэбнай склонавай форме. Абгрунтуйце напісанне займеннікаў.

1. Але аб тым, што ў *(нечы)* сэрцы выбух, парою нават блізкія не знаюць *(М. Танк)*. 2. Болей за ўсё на свеце Косця любіў чытаць кніжкі — абы*(які)*, каб толькі чытаць *(В. Быкаў)*. 3. Страціў слова, страціў спадчыннае слова — *(што)*сьці страціў у душы абавязкова *(Н. Гілевіч)*. 4. З сіняватых[сл] даляў, з сіняватай цьмы *(хто)*сьці напявае залатыя сны *(Т. Кляшторны)*. 5. Бачу я: нехта *(нехта)* любіць. Гэта іх справа, гэта іх права. Бачу я: нехта *(нехта)* губіць. Тут і мая ўжо справа *(А. Вярцінскі)*.

Растлумачце значэнне слова *спадчыннае* праз падбор аднакаранёвых.